| Шыфр |
|---|
| |

# II (РАЁННЫ) ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**2011/2012 н. г.**

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** *Беларускі мовазнавец Янка Станкевіч настойліва даводзіў, што "парадак літар беларускай кірыліцы павінен быць такі:* О, А, Э, Б, Г, Ґ, Х, Д, Е, Ё, Я, ДЗ, ДЖ, З, Ж, І, Й, К, Л, М, Н, Ф, П, Р, С, Ш, Т, ***В, У, Ў***, Ь, Ц, Ч, Ы, Ю".

Як Вы думаеце, чаму літара ***В*** аказалася ў такім «графічным асяроддзі»?

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 2.** Спалучыце паронімы ***гаспадарскі – гаспадарчы – гаспадарлівы*** з адпаведнымі ім словамі.

| **Словы** *вока, клопат, крок, пабудовы, пакой, погляд, справа, суседка, тавары, чалавек*: | |
|---|---|
| ***гаспадарскі*** | |
| ***гаспадарчы*** | |
| ***гаспадарлівы*** | |

**Заданне 3.** Устанавіце адпаведнасць паміж тэрмінамі, якія прапаноўваліся ў 20-я гг., і іх сучаснымі варыянтамі. Адказ запішыце ў форме літарна-лічбавага спалучэння.

| Тэрмін 20-х гадоў XX ст. | Сучасны адпаведнік тэрміна |
|---|---|
| **А.** старасвеччына | **1.** *гекзаметр* |
| **Б.** светлагляднасць | **2.** *градацыя* |
| **В.** шасцістоп | **3.** *архаізм* |
| **Г.** ступеняванне | **4.** *скептык* |
| **Д.** сумнявальнік | **5.** *ідэал* |
| **Е.** дасканальства | **6.** *аптымізм* |
| **Адказ:** | |

**Заданне 4.** Запішыце значэнне фразеалагізмаў. Укажыце, якія ўяўленні або з’явы рэчаіснасці ляжаць у іх аснове.

**1)** ***напускаць туману:***

**2)** ***даць лататы:***

**3)** ***па гарачых слядах:***

**Заданне 5.** У падборцы прыведзеных сказаў адзначце «лішні». Растлумачце свой выбар.

**1.** Не толькі думаць, дыхаць трэба на мове роднай... (*Р. Барадулін*).
**2.** «Ты пачакай заўчасна радавацца!..» (*М. Ваданосаў*).
**3.** Яна не магла не ўсміхацца, будучы сярод людзей (*А. Марціновіч*).
**4.** Ці не ўзяўся б ты сёння фашыны папраўляць? (*М. Лынькоў*).
**5.** *[Хадзіў на сплаў ён, на віціны, Разоў са два схадзіў у Прусы]* – Куды не трапяць беларусы? (*Якуб Колас).*

АДКАЗ:______________________

АБГРУНТАВАННЕ:

**Заданне 6.** Выкарыстоўваючы галоўную частку ***«Вясна яшчэ вернецца»***, складзіце складаназалежныя сказы са значэннем ***умовы, прычыны, мэты, уступкі, параўнання.***

**1)** Вясна яшчэ вернецца,
____________________________________________.

**2)** Вясна яшчэ вернецца,
____________________________________________.

**3)** Вясна яшчэ вернецца,
____________________________________________.

**4)** Вясна яшчэ вернецца,
____________________________________________.

**5)** Вясна яшчэ вернецца,

___________________________________________________________________________.

**Заданне 7.** Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце тып сказа, прывядзіце яго схему.

Кожным годам цёплым летам калі пачынаюць касіць едучы дадому спачатку адчуваеш трапяткі сыраваты холад на душы калі яшчэ раненька калі яшчэ толькі прагрукоча першы трамвай ідзеш на блізкі прыпынак пустою вуліцаю не падмеценым яшчэ тратуарам і з нейкай нецярплівасцю думаеш што недзе сёння пасля поўдня калі сонца спадзе на вечар калі ўсё неяк раптам прыціхне чакаючы жывое расы і вільготнае ночы будзеш дома (*В. Адамчык*).

ТЫП СКАЗА:________________________________________________________

СХЕМА СКАЗА:

**Заданне 8.** Запоўніце табліцу.

| **Род літарату ры** | **Аўтар – творчае імя** | **Аўтар – сапраўднае імя** | **Твор** | **Жанр** | **Ідэя і яе ўвасабленне** | **Характэрная цытата – ілюстрацыя з твора** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лірыка | | | "Явар і каліна" | Пейзажная / філасофская лірыка | Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармонія чалавека і прыроды. Адухаўленне вобразаў дрэваў | |
| Эпас / ліра-эпас | | Канстанцін Міцкевіч | | | Аўтабіяграфічны твор. Шырокае адлюстраванне народнага побыту і прыроды. Філасофская ідэя зямлі і волі | Мой родны кут, як ты мне мілы! |
| | Янка Купала | | | Сацыяльна-філасофская драма | Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны | *Сымон*: На вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!!! |

**Заданне 9.** Адзначце «лішняе» ў прыведзеным пераліку. Выбар растлумачце.

Барока, сентыменталізм, аповесць, кульмінацыя, рэалізм, паэма, раман, рамантызм, класіцызм.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:______________________________________

АБГРУНТАВАННЕ: ______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 10.** Устаўце прапушчаныя словы. Запішыце назву твора, псеўданім і сапраўднае імя аўтара, час напісання твора.

Вобразы мілыя роднага краю,
____________ і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя ______________________і жальбы нядолі,
Поўныя ______________________ красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
___________ мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня ___________ дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

НАЗВА ТВОРА:________________________________________

ПСЕЎДАНІМ:__________________________________________

САПРАЎДНАЕ ІМЯ АЎТАРА:____________________________

ЧАС НАПІСАННЯ ТВОРА:_______________________________